**Барыла, А.** 400 гадзін у афганскім небе / А. Барыла // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2008. — 13 лют. — С. 1.

# 400 ГАДЗІН У АФГАНСКІМ НЕБЕ

***Напярэдадні свята абаронцаў Айчыны, 15 лютага, у краіне адзначаецца Дзень воінаў-інтэрнацыяналістаў. Дзевятнаццаць гадоў таму савецкія войскі пакінулі межы Афганістана. Сто дзесяць месяцаў на афганскай зямлі пралівалася чалавечая кроў. Прычынай узброенага канфлікту сталі палітычныя амбіцыі магутнага СССР. У баявых дзеяннях прымалі ўдзел 530 тысяч савецкіх грамадзян, 15 тысяч аддалі жыццё за незалежнасць афганскага народа, 50 тысяч вярнуліся дамоў параненымі. Каля 30 тысяч беларусаў выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак, 752 загінулі ў афганскім пекле. Шаркаўчане таксама ваявалі. Многія ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Зараз на тэрыторыі раёна пражываюць чатыры дзесяткі воінаў-інтэрнацыяналістаў. Аповед пра аднаго з іх – Іосіфа Курыловіча –прапануем вашай увазе.***

Пасля заканчэння школы ў 1978 годзе перад Іосіфам Курыловічам паўстала пытанне аб выбары жыццёвага шляху. Здаўна хлопец марыў пра неба. Яму параілі пайсці вучыцца на курсы ў Віцебскі вучэбны авіяцыйны цэнтр ДТСААФ. Іосіф зрабіў выбар і пачаў займацца – рыхтаваўся стаць пілотам верталёта. Пасля некалькіх збораў атрымаў званне «малодшы лейтэнант».

Затым было Сызранскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Скончыўшы гэту навучальную ўстанову, Іосіф Курыловіч стаў добрым тэарэтыкам. Набірацца практычнага вопыту маладога лейтэнанта адправілі ў Беларускую ваенную акругу, на Пружаншчыну, у пасёлак Засімавічы.

Пачаліся вайсковыя будні: трывогі, вылеты, праца на трэнажорах. У 1982 годзе полк атрымаў загад аб адпраўленні ў Джалалабад, што ў Афганістане. Тады маладыя афіцэры нават не ведалі, што іх чакае наперадзе, бо ішла «неаб’яўленая» вайна, якая не афішыравалася. На пачатку пілоты вучыліся кіраваць вінтакрылымі машынамі ў горных умовах. У гэтым вялікую дапамогу аказвалі тыя авіятары, якія паспелі паваяваць ужо.

Малады лейтэнант Іосіф Курыловіч у складзе экіпажа верталёта МІ-24, які афіцэры называлі «кракадзілам», у хуткім часе распачаў баявыя вылеты. У задачы авіятараў уваходзіла суправаджэнне калон, бомбава-штурмавыя ўдары, прыкрыццё дэсанта.

Розныя карціны даводзілася бачыць з вышыні пілоту. Не раз Іосіф Курыловіч рызыкаваў жыццём. За тэрмін службы нашага земляка ў Афганістане (крыху больш года), у палку загінулі 5 лётчыкаў – два экіпажы. Расказаў пра выпадак, калі экіпаж МІ-8, што вывозіў параненых з поля бою, не пакінуў падбіты верталёт (кожны афіцэр меў парашут за спіной), – загінулі ўсе разам. Кожны дзень, пражыты на той «неаб’яўленай» вайне, быў, уласна кажучы, подзвігам. Але што мы пра гэта ведалі?

За плячыма воіна-інтэрнацыяналіста І. Курыловіча 250 баявых вылетаў, 400 гадзін пілот правёў у паветры. Кожны ўзлёт мог стаць апошнім: падчас афганскай вайны на аэрадромы не вярнуліся 333 вінтакрылыя машыны. Апрача таго, баявыя дзеянні сталі сапраўдным выпрабаваннем для савецкіх байцоў: высокая тэмпература, экстрымальныя ўмовы, вялікая фізічная і псіхалагічная нагрузка.

У 1983 годзе Іосіф Курыловіч вярнуўся з вайны. Медкамісія вынесла суровы вердыкт: лётчыкам яму не быць.

Напамінам пра афганскі перыяд жыцця засталіся медаль «За баявыя заслугі», Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета СССР, медаль «Ад удзячнага афганскага народа».

Зараз Іосіф Курыловіч працуе дарожнікам у ДВУ-26. Нядаўна праводзіў сына на службу ў армію, 9 лютага ў Валеры была прысяга. Пакуль ён у вучэбным цэнтры пагранічных войск у Смаргоні, затым трапіць у атрад. Валера не палохаўся арміі, бо з дзяцінства бацька вучыў яго быць моцным, таму служба Айчыне для яго не пустыя словы.

2 лютага Іосіф Курыловіч сустракаўся з аднакласнікамі – адзначалі 30-годдзе заканчэння школы і класным кіраўніком Я. Б. Чарвінскай. Успаміналі маладыя гады. Па словах былога афганца, ён удзячны настаўнікам за выхаванне. Яго вучылі не палохацца цяжкасцей. І ён, служачы Радзіме, выконваючы свой афіцэрскі абавязак з гонарам даказаў, што з’яўляецца дастойным яе грамадзянінам.

**А. Барыла**